УДК 811.161.3

# СТРУКТУРНА-СІНТАКСІЧНЫЯ МАДЫФІКАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ: ПРЫНЦЫПЫ СІСТЭМАТЫЗАЦЫІ

**Чайка Наталля Уладзіміраўна**
прафесар кафедры беларускага мовазнаўства ўстановы адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”;
доктар філалагічных навук, дацэнт
(г. Мінск, Беларусь)

Развіццё сінтаксічнай сістэмы беларускай мовы на сучасным этапе выклікала значнае пашырэнне адзінак дынамічнага сінтаксісу: канструкцый з эліпсісам дзеяслова, парцэляваных канструкцый, канструкцый з імпліцытнай семантыкай, з сінтаксічнай рэдукцыяй і кампрэсіяй, вытворных канструк-



ный архив библиотеки МГУ имени А.А.

цый, падпарадкаваных універсальным філасофскім законам актуалізацыі неабходнай інфармацыі. Антрапацэнтрычны характар сучасных моўных працэсаў выклікаў тэндэнцыю да ўдасканалення механізмаў рэгулявання моўнай сістэмы, што паўплывала на карэляцыю паміж развіццём мыслення і матэрыяльнымі сродкамі яго выражэння. У сувязі з гэтым тыпалагічнае апісанне адзінак дынамічнага сінтаксісу з выяўленнем спецыфікі моўных з'яў і заканамернасцей іх функцыянавання стала адным з прыярытэтных напрамкаў айчыннага і замежнага мовазнаўства. Гэту працу ў поўным аб'ёме магчыма ажыццявіць толькі з дапамогай вытлумачальнага патэнцыялу тыпалагічнай характарыстыкі аб'екта і метадалогіі, якая выяўляе сутнасць і прыроду сінтаксічнай з'явы.

Адным са складаных і актуальных пытанняў сучаснага дынамічнага сінтаксісу з'яўляецца кваліфікацыя і класіфікацыя структурна-сінтаксічных мадыфікацый беларускай мовы. На сённяшні дзень пытанне пра варыянтныя формы сказаў вырашаліся ў межах розных сінтаксічных напрамкаў – логіка-граматычнага [1; 2], псіхалагічнага [3; 4], структурнага [5; 6], семантычнага [7; 8], функцыянальнага [9; 10]. Стракатасць і супярэчлівасць канцэпцый сведчаць пра неабходнасць якасна новага падыходу да аналізу з'яў дынамічнага сінтаксісу, які адпавядаў бы накіраванасці навуковага пазнання новага часу, адлюстроўваў сутнасць сінтаксічных з'яў і заканамернасці іх функцыянавання з улікам антрапацэнтрычнага характару сінтаксічных працэсаў.

Найбольш мэтазгодным і прадуктыўным лічым сінхронны тыпалагічны аналіз з'яў у сінтаксічнай сістэме беларускай мовы. Актуальнасць падобнага аналізу абумоўлена адсутнасцю ў лінгвістычнай літаратуры канцэптуальнага апісання структурна-сінтаксічных мадыфікацый у сучаснай беларускай мове з вызначэннем тэарэтычных асноў і метадалагічных прынцыпаў іх даследавання. Важна выявіць кваліфікацыйныя, класіфікацыйныя і сістэмаўтваральныя параметры для аналізу і ўпарадкавання эліптычных канструкцый. Такі падыход дазволіць ахарактарызаваць варыянты сінтаксічных канструкцый не па аналогіі з поўнымі, а ў адпаведнасці са спосабамі экспплікацыі структурных, семантычных і прэдыкатыўных катэгорый дзеяслова, зрабіць класіфікацыю непасрэдна сказаў і іх кампенсаторных сродкаў.

Сказанае вышэй указвае на неабходнасць пабудаваць кампенсаторную сінтаксічную тыпалогію структурна-сінтаксічных мадыфікацый у сінтаксічнай сістэме сучаснай беларускай літаратурнай мовы, распрацаваць тэарэтычныя асновы кампенсаторнай сінтаксічнай тыпалогіі, вылучыць структурныя тыпы мадыфікацый, устанавіць іх частотнасць і прадуктыўнасць, выявіць структурна-семантычныя мадэлі і схемы.

Актуальнасць падобнага даследавання абумоўлена неабходнасцю стварэння новага напрамку ў пабудове функцыянальных сінтаксічных тыпалогій – кам-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пенсаторнага, распрацоўкі канцэпцыі сінхроннага тыпалагічнага даследавання структурна-сінтаксічных мадыфікацый беларускай мовы на аснове кампенсаторнай прыкметы, верыфікацыі тэарэтычных асноў кампенсаторнай сінтаксічнай тыпалогіі для аналізу і сістэматызацыі мадыфікаваных канструкцый.

Для класіфікацыі структурна-сінтаксічных мадыфікацый у беларускай мове намі выкарыстоўваліся фактары сістэматызацыі – *структурныя:* рэгулюецца кампенсаторная функцыя дэтэрмінаваных членаў сказа, адасобленых акалічнасцей, кампанентаў складанага сказа і складанага сінтаксічнага цэлага (пры маркіроўцы значэнняў тэмпаральнасці), зваротказў; парцэляваных і ўстаўных канструкцый (пры маркіроўцы значэнняў мадальнасці і персанальнасці), *структурна-сэнсавыя:* пры маркіроўцы значэнняў тэмпаральнасці абумоўліваецца кампенсаторная функцыя часціц і лексічных сродкаў, маркіроўка значэнняў персанальнасці эксплікуецца лексічнымі сродкамі – асабовымі займеннікамі або ўласнымі ці агульнымі назоўнікамі; *фармальна-граматычныя*: забяспечваюць маркіроўку значэнняў мадальнасці з выкарыстаннем марфалагічных сродкаў: формаўтваральных часціц, якія ўказваюць на значэнне асобы, безасабова-прэдыкатыўных прыслоўяў, дапаўненняў; *семантычнай імплікацыі*: спосабам пераемнасці кампанентаў аб'ектна-суб'ектнага тыпу ў структуры складанага сказа або складанага сінтаксічнага цэлага рэгулюецца значэнні персанальнасці; *з дапамогай сінтаксічнага паралелізму* маркіруюцца значэнні тэмпаральнасці на аснове сінтаксічнай і граматычнай аднапланавасці кампанентаў, што ахопліваюць паратаксічную сінтаксічную сувязь (аднародныя выказнікі і часткі складаных канструкцый). У структуры складанага сказа або звышфразавага адзінства спосабам кампенсацыі значэння персанальнасці выступае сінтаксічны паралелізм.

У аснове тыпалогіі структурна-сінтаксічных мадыфікацый ляжыць кампенсаторная прыкмета – новае паняцце, што характарызуе механізм замяшчэння ў іх структурна-семантычных і прэдыкатыўных значэнняў. Кампенсаторнай прыкмеце ўласцівы ўніверсальнасць – маштаб ахопу сінтаксічных з'яў; кваліфікацыйны характар – адсутнасць карэляцыйнай апазіцыі; інтэгральная функцыя – здольнасць аб'ядноўваць сінтаксічныя адзінкі ў класы на аснове спосабаў і сродкаў кампенсацыі сэнсу.

Кампенсаторная прыкмета ўключае кампаненты сінтаксічнага, семантычнага, марфалагічнага, лексічнага ўзроўняў. Функцыянальная прыналежнасць гэтых адзінак залежыць ад аб'екта маркіроўкі – семантыкі або прэдыкатыўных значэнняў эліпсаваных канструкцый. У залежнасці ад функцыянальнага дыяпазону кампенсаторныя кампаненты падзяляюцца на канстантныя; монафункцыянальныя; поліфункцыянальныя.

На аснове распрацаванай метадалогіі намі вылучаны механізмы рэгулявання кампенсаторнай функцыі кампанентаў структурна-сінтаксічных

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

мадыфікацый: структурна-сэнсавыя, сэнсавыя, фармальныя, актуалізацыйныя, інтэрпрэтацыйныя. Структурна-сэнсавыя моўныя механізмы забяспечваюць кампенсаторную функцыю прэдыкатыўных частак у структуры executive поліпрэдыкатыўнай сінтаксічнай адзінкі, кампанентаў ускладненых сінтаксічных адзінак на аснове разгортвання, пашырэння іх сінтаксічных пазіцый. Сэнсавыя моўныя механізмы рэгламентуюць замяшчэнне эліпсаванага кампанента функцыянальна тоесным у структуры сказа і звышфразавага адзінства; вызначаюць дыяпазон функцый словаформ у парадыгме структурна-сінтаксічных мадыфікацый з імпліцытнай семантыкай. Фармалізацыя рэгулюе арганізацыю семантычных тыпаў адзінак дынамічнага сінтаксісу ў адпаведныя мадэлі і схемы. Актуалізацыя абумоўлівае эксплікацыю прэдыкатыўных значэнняў сродкамі сінтаксічнага, марфалагічнага, лексічнага ўзроўняў спосабам імплікацыі і пераемнасці кампанентаў. Інтэрпрэтацыя ўстанаўлівае фактары ідэнтыфікацыі семантычнай і сінтаксічнай функцый словаформы ў парадыгме структурна- сінтаксічных мадыфікацый.

**Літаратура**


1. Греч, Н. И. Практическая русская грамматика / Н. И. Греч. – 2-е изд., испр. – СПб. : Тип. изд., 1834. – 2, VIII, 526 с.
2. Буслаев, Ф. И. Историческая грамматика русского языка : в 2 ч. / Ф. И. Буслаев. – 5-е изд. – М. : Кн. магазин насл. бр. Салаевых, 1881. – Ч. 2. –394 с.
3. Дубовцева, Т. Ф. Семантизация эллиптических конструкций как условие их функционирования в диалоге (на материале англоязычных, немецких и русских драматических произведений) / Т. Ф. Дубовцева // Взаимодействие социальных и структурных факторов в языке и речи : сб. ст. / Сарат. ун-т ; редкол. : Л. И. Баранникова (отв. ред.) [и др.]. – Саратов, 1988. – С. 79–84.
4. Назаров, А. Н. К вопросу о выделении неполных предложений в особый грамматический тип / А. Н. Назаров // Вопросы синтаксиса и стилистики русского литературного языка : тр. III–IV конф. каф. рус. яз. пед. ин-тов Поволжья (1959–1960) / Куйбышевск. гос. пед. ин-т ; редкол. : А. Ф. Ефремов [и др.]. – Куйбышев, 1963. – С. 88–97.
5. Harma, J. Sur l'omission du verbe et sa recuperabilité en français / J. Harma // Actes du 9e Congrès des romanistes scandinaves, Helsinki, 13–17 aout 1984. –Helsinki, 1986. – P. 135–146.
6. Wiśniewski, M. Przegląd równoważników zdania znamiennych dla współczesnej polszczyzny / M. Wiśniewski // Acta Univ. Nicolai Copernici. Nauki Humanistyczno-społecz. Filologia Polska. – Toruń, 1995. – T. 46. – S. 115–150.
7. Мухин, А. М. Структура предложений и их модели / А. М. Мухин. – Л. : Наука, Ленингр. отд-ние, 1968. – 230 с.
8. Колосова, Т. А. Русские сложные предложения асимметричной структуры / Т. А. Колосова. – Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1980. – 164 с.
9. Лекант, П. А. К проблеме неполных предложений в русском языке / П. А. Лекант // Учен. зап. / Моск. обл. пед. ин-т. – М., 1963. – Т. 139, вып. 9 : Русский язык и литература. – С. 43–49.
10. Золотова, Г. А. Очерк функционального синтаксиса русского языка / Г. А. Золотова. – М. : Наука, 1973. – 351 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова